CORE Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

Азаронак, С.Р. Праблема зместу гістарычнай адукацыі на Беларусі ў 70-я гг.ХХ ст. / С. Р. Азаронак // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 103–105

*С. Р. АЗАРОНАК*

# ПРАБЛЕМА ЗМЕСТУ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ Ў 70-я гг. XX ст.

Актыўная праца над абнаўленнем зместу гістарычнай адукацыі, над выпрацоўкай канцэпцыі айчыннай гісторыі абумоўлівае інтарэс да дынамікі развіцця прафесійнай падрыхтоўкі гісторыкаў у сістэме вышэйшай школы.

У савецкі час у галіне гуманітарных навук, у тым ліку гісторыі, не ў поўнай меры надавалася ўвага фарміраванню творча думаючых прафесіяналаў. Ад гісторыкаў патрабавалася пэўнае засваенне гістарычных фактаў з прымяненнем тэарэтычных вывадаў марксісцка-ленінскай канцэпцыі развіцця гістарычнага працэсу. Існавала сістэма зададзенага тлумачэння гістарычных заканамернасцей, ствараліся стэрэатыпы і дагматычныя формы ва ўсіх раздзелах гістарычнай навукі. Гэта перашкаджала выпрацоўцы ў спецыялістаў-гісторыкаў асабістых меркаванняў па ацэнцы гістарычных падзей, прысутні-



чалі негатыўныя адносіны да паняцця альтэрнатыўных пунктаў погляду на гісторыю.

Змест гістарычнай адукацыі складаўся з вывучэння важных праблем гісторыі Беларусі, якія вызначаліся партыйна-дзяржаўнымі органамі. Гісторыя СССР і БССР падзялялася на два буйныя гістарычныя перыяды: дасавецкі і савецкі. Мяжой з'яўляліся падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Адпаведна існавалі і кафедры гісторыі СССР дасавецкага перыяду і гісторыі СССР эпохі сацыялізму [1]. Лічылася мэтазгодным праводзіць лекцыі па гісторыі БССР дасавецкага і савецкага перыядаў розным выкладчыкам [2]. Пры вывучэнні дасавецкага перыяду гісторыі Беларусі ўвага надавалася вузлавым праблемам гістарычнага працэсу: эвалюцыі сацыяльна-эканамічнага жыцця, развіццю класавай барацьбы, рэвалюцыйнаму руху, прагрэсіўнай грамадска-палітычнай думцы і замоўчваліся, не раскрываліся цэлыя гістарычныя перыяды, заніжаліся ці зусім не паказваліся культурныя здабыткі.

Пры вывучэнні гісторыі Беларусі савецкага часу галоўная ўвага надавалася дзейнасці камуністычнай партыі — арганізатара Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва, фарміраванню партызанскага руху, перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне. Пры вызначэнні ролі партыі ў гісторыі Савецкай Беларусі акцэнт рабіўся на гаспадарча-арганізатарскай (выкананне чарговых пяцігодак) і палітыка-выхаваўчай рабоце. У выніку асаблівасцю падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай гістарычнай адукацыяй з'яўлялася спалучэнне прафесійных і асабістых якасцей з ідэалагічнай арыентаванасцю.

У працэсе падрыхтоўкі і выхавання спецыялістаў-гісторыкаў, развіцці гістарычнай навукі значная ўвага надавалася аналізу і крытыцы замежнай гістарыяграфіі наогул і айчыннай у прыватнасці. Аб важнасці працы ў гэтым накірунку сведчыць стварэнне ў 1968 г. у сістэме Інстытута гісторыі АН БССР сектара замежнай гістарыяграфіі Беларусі, у задачу якога ўваходзіла вывучэнне замежнай літаратуры аб Беларусі і падрыхтоўка матэрыялаў для партыйных і дзяржаўных органаў рэспублікі па гэтых пытаннях. На пачатку працы сектар меў пэўныя цяжкасці. Загадчык сектара кандыдат гістарычных навук В. Ф. Раманоўскі ў сваёй дакладной запісцы ў ЦК КПБ тлумачыў іх адсутнасцю заказанай літаратуры: «Нам известно, что поступившая по нашым заявкам зарубежная литература задержана в Москве Комитетом по охране государственных тайн в печати при СМ СССР» [3]. Праз пэўны час літаратура была атрымана, на якую сектар зрабіў разгорнутыя анатацыі манаграфій, брашур, артыкулаў, частку з якіх апублікавалі ў навукова-рэфератыўным бюлетэні «Агляд замежнай літаратуры» [4].



З аналізу літаратуры быў зроблены вывад аб тым, што замежныя аўтары праяўляюць пэўны інтарэс да гісторыі перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, устанаўлення Савецкай улады на Беларусі і ўтварэння БССР.

У адрозненне ад савецкай гістарыяграфіі, замежныя аўтары на асноўныя, ключавыя пытанні гісторыі Беларусі мелі супрацьлеглы погляд.

Асноўныя з іх:

- перамога сацыялістычнай рэвалюцыі і ўстанаўленне Савецкай улады на Беларусі прадстаўлялася працэсам гвалтоўнай саветызацыі, вынікам змовы, уплыву салдат Заходняга фронту;

сацыялістычная рэвалюцыя на Беларусі не з'яўлялася гістарычнай заканамернасцю і аб'ектыўнай неабходнасцю, не вынікала з развіцця эканамічных і сацыяльных адносін, з рэвалюцыйнага руху народных мас;

прыніжалася роля народных мас у рэвалюцыі, даказвалася штучнасць Савецкай улады, скажалася роля мясцовых бальшавіцкіх арганізацый;

па-іншаму прадстаўляўся працэс утварэння БССР: стварэнне рэспублікі бальшавікамі было здзейснена як адказ на ўзнікненне Рады БНР;

вызваленне Беларусі Чырвонай Арміяй ад нямецкіх захопнікаў і белапольскіх акупантаў прадстаўлялася працэсам заваявання тэрыторыі рэспублікі [5].

У адказ на альтэрнатыўнае бачанне гісторыі Беларусі планавалася напісаць брашуру аб перамозе сацыялістычнай рэвалюцыі і ўстанаўленні Савецкай улады на Беларусі, утварэнні БССР, разлічаную ў асноўным на замежных чытачоў.

Такім чынам, беларуская гістарычная навука надавала пэўную ўвагу замежнай гістарыяграфіі аб Беларусі. Гістарычная навука ў БССР у вызначаны перыяд развівалася не ў поўнай ізаляцыі, але пры гэтым пануючая камуністычная ідэалогія не дазваляла пранікнуць навуковым інавацыям у працы айчынных гісторыкаў. Аналіз заходняй гістарычнай літаратуры быў магчымы як крытыка буржуазных фальсіфікацый гісторыі і праводзіўся з адназначна негатыўных пазіцый.

---

[1] НАРБ. Ф. 205. Воп. 8. Спр. 1571, 1572.

[2] НАРБ. Ф. 746. Воп. 5. Спр. 910. Л. 1.

[3] НАРБ. Ф. 4. Воп. 73. Спр. 287. Л. 247.

[4] НАРБ. Ф. 4. Воп. 73. Спр. 288. Л. 40.

[5] Там жа. Л. 40—43.